Поезд адыйшоў.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Саля Гасударственнай Думы. Дэпутат Гундасюк блукае паміж задніх крэсел і ўважна прыслухаецца. Пачуўшы слова „зямелька“, ясьнее раптам і падходзіць да грамадкі селян, што гэтак сама шукаюць сабе мейсца.

— Вы чаго тут аціраецеся?—пытае Думскі прыстаў.

— Ды от... ня ведаем, дзе тут прымасьціцца.

— Туды сядайце, — паказывае прыстаў на права.

— Каб ня ўскочыць... усякаго народу тут поўна. Нам бы да тых, што зямелькі для мужыка старацца будуць.

— Будзе, будзе, ўсе будзе, садзіцеся!

Дзядзькі тоўпяцца, сядаюць, аглядаюць і пробуюць рукамі лаўкі, перэкідаючыся вачамі.

Пачынаюцца выбары думскаго маршалка.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Пасьля Каляды.

Серэда. Праглядаюць запрос міністру Кассо с прычыны арэшту вучнёў сярэдніх школ.

Прагавіта слухае дэпутат Гундасюк усіх прамоўцоў, намагаючыся злавіць хоць нешта схожае на слова „зямелькі“. У канцы траціць цярплівасць і просіць слова.

За якую гадзіну ён на амбоні.

— Паны дэпутаты... я гэтак сама хачу спытаць...

— Што? што ён чаўпе? нясецца с правых крэсел.

— Запытаць хачу... дзеля таго, што слухаю, слухаю—ніхто ані зюкне аб зямельцы. А мужыку без зямлі, самі добра ведаеце...

— Скажы да ладу,—перэпыняе прамоўцу маршалак.

— Ага, ага... да ладу нашчот прырэзкі.

— Проч з амбоны!—гудзіць правы бок салі.

— Тут дзела, а ён з драбніцамі ідзе!

— Ганіце па карку!

— На шыбеніцу яго! павесіць!

— Розгамі гада!

Гундасюк здурнеў. Бледны, хістаючыся і ледзьве перасовываючы ногі, даходзіць ён да свайго мейсца, шэпчучы непрытомна.

— За... за... што-ж вешаць?.. Лепей ужо ніхай розгамі... У мяне-ж дома жонка, дзеткі маленькіе...

Другіе селяне гэтак сама абурэны непрапорціей праступку і кары, але у пярорве прыстаў іх успакаівае.

Э, гэта йшчэ нічога... А то часам такая гармідэсія падыймецца, што, паверце, сьцены чырванеюць.

— Дык чаго-ж гэта яны злуюць гэтак?

— Чаго? Такая павіннасць, пэўне, каб калі толькі аб мужыку хто загаворыць—заткнуць глотку лямэнтам.

— А ім хіба ня можна заткнуць, каб запішчэла?

— Дзе вам! закону такога німа.

Дзядзькі пачалі раіцца і прыпомніўшы, што іх выбралі рабіць законы, гэтак сама вырабілі закон, каторы і хочуць вось падаць на рэзгляд Думы пад загалоўкам:

— „Каб аж запішчэла-б ім!“...

*Провінціял „Рада“.*

## Сычам і совам.

Неба на ўсходзе чуць-чуць зашарэла;
Шырыцца сьвет і расьце бы з зямлі...
Вось ужо й першы праменьня ня сьмела
На векавечные хвоі ляглі.
Зразу збудзіўся гай цёмны да жыцьця
Першы за ўсіх засьпеваў салавей,
І пакацілася песьня па ніўцы
Шырэй і далей, мацней і мацней...
Гэта учуўшы пташкі ўзняліся,
Яснае сонцэ хвалой сустрэчаць.
Што-ж вы йшчэ совы, сычы так ўзяліся
Плакаць і сумна стагнаць?
Ваша пара ўжо прайшла, мінавала,
Цемраво сонцэ прагнало з гаю
Песьні другіе жыцьцьцё запеяло...
Кіньце вы песьню маркотну сваю.
Гляньця (ні бачаць, бо вочы сьляпыя),
Ужо разсьвітала! Пара перастаць!
Вам не вярнуці часіны начные,
І сьвету вам з гаю не ўдасцца сагнаць!
Лезьця хутчэй вы ў пацёмные норы,
Будзе паганые песьні сьпеваць!
Ґымнамі шчасьця вясёлые хоры
Выйшлі ўжо яснасць хвалой сустрэчаць!..

**М. Арол.**

## Горэ мацеры.

Сьвежая магіла
Выкапана ў долі.
Сумны звон царкоўны
Ціха млее ў полі,
Хваляю гаротнай
Коціцца да гая,
Смутным, смутным жалем
Душу напаўняе.
Стогне звон хаўтурны,
Як жывы, галосіць...
Аб чыей-жэ сьмерці
Весткі ён разносіць?
За сялом у полі,
У жоўценькім пясочку,
Пахвала матка
Маладую дочку.
Знікла яе радасьць,
Старасьці апора,
І німа уцехі
У мацерынскім горы.
Ей ніхто ня верне
Дарагой дачушкі!
Плачуц па дзяўчыне
Сваякі і дружкі;
Плачэ па ёй мілы,
Жаль яго вялікі;
Сціхне-ж яго горэ,
Змоўкнуць сэрца крыкі,
Ганначку забудуць
Сваякі і дружкі;
Толькі ні забудзе
Матанька дачушкі!
Не залечыць час
Сэрца яе раны,
І з вялікім горэм
Сойдзе ў гроб дрэўляны.

**Якуб Колас.**

## Я хацеу-бы.

Ня трэба мне славы, харом залатых,
Заў сягды я адно буду правіць:
Я атдаў-бы ўсе, каб у песьнях сваіх
Родну старонку мог ўславіць!

---

У мяне нет нічога, нічога ані!
Ні каня, ні сахі, ані хаты!
І ня трэба мне,—толькі каб песьні мае
Я хацеў-бы былі каб багаты.
Каб багаты былі яны словом жывым,
Шчырай праўдай, пачуцьцем прыветным...
Каб пацехай і катам былі яны злым,
Мае песьні і гневам сусьветным!
І каб песьні мае былі гулкі, як звон
Той, разносіць што весткі сьвятые,
Каб яны разагналі сьмяротны той сон,
Што скаваў гэтак душы людзкіе.
Каб ліліcь мае песьні вясенскім руччом,
Што змываіць апошні сьнег с поля...
Каб былі заўсягды яны добрым ключом
Ад замкоў тых. дзе праўда і доля!..
А ешчэ я хацеў-бы, каб песьні мае,
Былі люстрам душы маей кволай,
Тады-б я ўсе горкіе думы свае,
У песьні-б казаў не вясёлай.
Тады-б атклікнуўся мне родны мой край
Пазнаўшы мой голас праўдзівы...
Тады я у песьнях знашоў сабе рай
І быў-бы саўсім я шчасьлівы!

**Жук Сакалоўскі.**

## Аб усім па троху.

**Ваенная павінасць у 1913 гаду.**

Міністэрства ўнутрэнных спраў цыркулярам загадало, каб прызыўные сьпіскі у гэтым гаду былі усе закончэны да 1 марца. Гэтые сьпіскі да 15 марца павінны быць вывешэны у гарадзкіх управах, і валасных ды сельскіх упраўленьнях. У гэтым часе (да 15 марца) усе каго ні так запісалі, ці прапусьцілі, могуць падаваць заявы і абмылкі, павінны зара папраўляць, а пропускі упісываць. Хто прапусьціць тэрмін яўкі ў набор можэ падаваць заяву толькі тады, калі на гэты пропуск былі асабліва важные прычыны, ці варункі. У прызыўные сьпіскі будуць запісаны усе асобы каторые да 1 студня 1913 будуць мець 20 гадоў. Дзеля гэтаго усе тые, хто у гэтым гадоу канчае 20 гадоў павінны самі праверыць ці яны запісаны у сьпіскі, ці можэ запісалі каго небудзь хто і не акончыў 20 гадоў; праверыць трэба дзеля таго, каб пасьля не было якога недаразуменьня. Тые, хто хочэ дастаць атсрочку, каб кончыць навукі, павінны рабіць аб гэтым асобнае старэньне.

**Азброеньня.**

Не дармо кажуць, што у Эўропе згода трымаецца на штыках, бо пакуль усе дзержавы маюць адзінакаваю сілу, большые у адзіночку, а меншые хаўрусам, датуль адзін на аднаго баяцца кінуцца. Гэтак, калі у якой дзержаві павялічываюць ваенную сілу, то і другіе дзержавы робяць гэта самае у сябе.

Апошнімі часамі, адвечные ворагі Францця і Нямеччына асыгнавалі сотні мільёноў на узмацаваньне сваіх ваенных сіл; даведаўшыся аб гэтым сябра Нямеччыны—Італія, пасьпяшыла на гэты год нават падвоіць свае ваенные выдаткі.

Само сабой; што і суседка Нямеччыны, з усходняго боку—Расея, ведаючы, што нямецкае азброеньне у першы чарод можэ проці яе зьвярнуцца, ні асталася з заду. Гэтымі днямі Гасуд. Дума асыгнавала экстрэнна грошы на будоўлю ваенных караблёў і асыгнавала блізка што ў троя больш за Францію. Узноў-жэ новы закон, аб тым, каб новобранцоў у гэтым гаду браць малодшых, тых, што скончылі 20 поўных год, падвоіць сёлетні набор і расейскай арміі прыбудзе больш чым 100,000 лішніх штыкоў і гэта, само сабой, павялічыць вельмі выдаткі на ваенную абарону гасударства.

Нікому не тайна, што найбольшы цягар утрыманьня арміі падае на вясковых жыхароў-селян, с прычыны парадку якім у нас цяпер выбіраюцца падаткі. Заграніцай народ багацейшы, дык і цягар павялічэных расходоў на армію ні так крэпка пачуе, чым у нас. Дзеля гэтаго заможнасць селянства, на каторай гэтак сама стаіць моц гасударства, павінна шмат панізіцца. Гэтак адбіваецца на нас тое, што

## Посная гусяціна.

Хоць і бедзен быў Дзяніс Гарбулёнак, але ніколі нікому ні жаліўся і як мог скрываў пеперад людзьмі сваю беднасць.

Праўда ён ведаў, што ніхто нічога ні атбярэ і лепшаго ні дасць, але гэткі ужо звычай меў: сыт—маўчыць, галодзен, слоўка ні скажэ, што есці хочэ.

Вёска Дзірванцы, гдзе радзіліся Дзянісавы дзяды, бацькі і ён сам, лічылася за самую бяднейшаю у ваколіцах, і досыць толькі здалёку глянуць на ламочча гэтых сермяжных багатыроў, то ўжо надоўга заставалося у памяці таго. Хаты ат хлявоў можна было адрожніць толькі па комінах. У гэткім ломе, жыў Дзяніс з маткай, кідаючыся як кот у мяху.

Хлопец малады, працавіты, як вол, то у сябе, то у людзей, рад быў пагуляць і вось, калі ні калі то у Дзірванах, а то у Лядах, па суседзтву, хлопцы збіраліся сямейкай і весялілі свaё гора.

Бывала Дзяніс, адыходзіў далёка, ад вёскі і час праводзіў казалі у чужых, ну а як сам маўчаў, то ніхто пэўна ня мог ведаць гдзе блукае Дзяніс.

Але шыла, як кажуць, у мяху ні утаіш, так і Дзянісава сьцежка атапталася і сярбы даведаліся, што у весьцы Бягунцах, жыла нейкая Кацярынка каторая прыгарнула сіраціну.

Туды абы час, Дзяніс плёўся пагаманіць с Кацярынкай.

Там ужо ён быў, як свой. Прыдзе бывала—палуднуюць, Дзяніса просюць, а той ані блізка, дзякую кажэ, выходзючы палуднаваў.

„Ну а што-ж ты еў, што ты еў, „сакатала Кацыранка, пахваліся!“

Што было на гэта казаць, валіць проста з мосту што галодзен, як воўк, ні хацеў, а каб атчапіцца ні запінаючыся атказываў: сяговьня её гусяціну, а калі траплялося пападаць другім разам к палудню, на пытаньне Кацярынкі казаў,—еў парасяціну.

Дзяучына дужа хітра была, ведаючы па расказу Дзірваноўцаў яго жыцьцё, ня верыла Дзянісу, і наважыла перэканацца, чы праўда—што ён баіць.

У той час, калі меўся быць Дзяніска, яна нічога нікажучы, абчэпілялася шатамі і гайда туды, гдзе жыў яе багач. Прыходзе. Слова, другое, старая адразу згадзілася пусьціць яе на нач, гледзючы з больлю у сэрцы на яе лахманы.

Дзяніса не было дома, той ня ведаючы гэткаго апуканства, нават спаткаўся з ей, ідучы у Бягунцы але яму і у галаву не прышло, што гэта ішла ня убогая, а яго Кацярынка.

Пагаманіўшы з старымі, ён паплёўся да дому, пытаючыся у сябе, гдзе-ж магла яна быць?

А тым часам, духі ужо гэтак падвяло, што ледзьве на ззьеў сабаку, што напаткалася яму.

Заледзьве прышоў да дому. Азірнуўшыся кругом, ён убачыў, што на печы нехта спаў. Маці кажэ:—убогая!—Убогая, дык убогая, не выганяць жэ, усе людзі, усім жэ жыць хочэцца.

— Мамка, а чы німа чаго павячэраць, есці дужа хочэцца.

— Есціка троха кашы, і тая, як глей посная. Хіба спрабуй, але не ўясі.

Дзяніс нічога нікажучы, эгроб з прыпечка гаршчок, зняў с паліцы сподак з алеем, памачыў туды кноцік і апчэдна папырскаў на кашу.

Тые кроплі, што ляніва спаўзлі с кнота, бытцым давалі смаку, і каша варочаючыся у Дзянісавых пашчэнках праз хвілю знікла.

Кацярынка с печы усэ бачыла, і ні як ні магла дачакацца раніцы. Дзянісава сэрца і яго пачуцьцё, было для яе ясно, як зорка.

Ніхто ні бачыў, як уцекла з хаты яна.

Праз нейкі час, прыходзе Дзяніс, праўда ні задоўга да полудня. Ну, ведама, просяць разам за стол. Той ані блізка. Сыт, кажэ сыт.

Ну што-ж ты еў, што-ж ты еў, пытаецца Кацярына, шчыра гледзючы яму у вочы.

— Кажы толькі праўду.

— Гусяціну, неяк ужо боязна атказаў Дзяніс.

